Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
__________ В.Р. Языковіч
«25» 03 __________ 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-94/ эвуч.

# КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МУЗЕЯЎ

*Вучэбная праграма па спецыяльнасці*
*II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 02*
*Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*Прафілізацыя: Культурная спадчына і музеялогія*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі II ступені ОСВО 1-23 80 02-2019 па спецыяльнасці 1-23 80 02 «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны», вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці II ступені 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Прафілізацыя: Культурная спадчына і музеялогія. Рэгістрацыйны нумар Е 23-2-20/вуч. ад 18.04.2019

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*І.Г. Лупашка,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Я.Л. Іванова,* намеснік дырэктара па лічбавых тэхналогіях і сувязях з грамадскасцю дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь», кандыдат культуралогіі;

*С.А. Пацыенка,* дацэнт кафедры менеджмента сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*Кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 8 ад 24.01.2019);

*Прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 3 ад 20.02.2019).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сучасных умовах значная ўвага надаецца развіццю музейнай справы. Культурна-адукацыйная дзейнасць – адзін з асноўных напрамкаў музейнай дзейнасці, значны складнік у працэсе музейнай камунікацыі. Такія абставіны робяць вучэбную дысцыпліну «Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў» надзвычай актуальнай і важнай у працэсе падрыхтоўкі магістрантаў.

*Мэтай* выкладання вучэбнай дысцыпліны «Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў» з'яўляецца вывучэнне магістрантамі гістарычных асноў і тэарэтычных аспектаў культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, а таксама сучасных тэндэнцый у гэтай галіне.

У адпаведнасці з мэтай вызначаны наступныя *задачы*:

– прасачыць на фактычным матэрыяле гісторыю развіцця культурна-адукацыйнага кірунку музейнай дзейнасці;

– засвоіць агульныя тэарэтычныя палажэнні музейнай педагогікі як асновы культурна-адукацыйнай дзейнасці;

– сфарміраваць дакладнае ўяўленне аб методыцы распрацоўкі і правядзення базавых форм культурна-адукацыйнай дзейнасці;

– азнаёміць з інавацыйнымі формамі культурна-адукацыйнай дзейнасці;

– вывучыць вопыт выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій у культурна-адукацыйнай дзейнасці.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі ІІ ступені па спецыяльнасці 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і музеялогія):

- СК-9. Бць здольным аналізаваць рэпрэзентатыўныя тэхнікі музейных экспазіцый у пытанні канструявання культурнай ідэнтычнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасля вывучэння дысцыпліны магістранты павінны *ведаць:*

– асноўныя гістарычныя этапы ў развіцці культурна-адукацыйнай дзейнасці айчынных музеяў;

– агульныя тэарэтычныя палажэнні музейнай педагогікі як асновы культурна-адукацыйнай дзейнасці

– найноўшыя тэндэнцыі ў галіне культурна-адукацыйнай дзейнасці;

*умець:*

– аналізаваць і выкарыстоўваць тэарэтычныя палажэнні музейнай педагогікі;

– арыентавацца ў навуковых даследаваннях па праблемах музейнай камунікацыі;

– вызначаць аптымальныя формы культурна-адукацыйнай работы для розных катэгорый музейнай аўдыторыі;

– прымяняць на практыцы атрыманыя тэарэтычныя веды ў галіне культурна-адукацыйнай дзейнасці (умець распрацаваць і правесці базавыя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці).

Для больш глыбокага засваення матэрыялу, акрамя аўдыторных заняткаў, у якасці самастойнай работы прадугледжваецца наведванне магістрантамі музеяў, выстаў, прагляд і аналіз мультымедыйных матэрыялаў.

Пры вывучэнні вучэбнай дыцыпліны “Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў” выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп’ютарныя тэхналогіі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны адведзена ўсяго 108 гадзін, з іх аўдыторных – 36 гадзін (лекцыі – 24, семінары – 12).  Для завочнага навучання - 12 аўдыторных гадзін, з якіх лекцыі – 8 гадзін, семінары – 4 гадзіны. Рэкамендаваная форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны*

Задачы, структура і змест вучэбнай дысцыпліны. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Агульная характарыстыка крыніц і літаратуры. Асноўныя паняцці: культурна-адукацыйная дзейнасць, музейная педагогіка, музейная камунікацыя, музейная аўдыторыя і інш. Адукацыйна-выхаваўчая функцыя музеяў.

*Тэма 1 Асноўныя этапы культурна-адукацыйнай дзейнасці айчынных музеяў*

Залежнасць культурна-адукацыйнай дзейнасці музея ад сацыякультурнай сітуацыі. Асноўныя этапы культурна-адукацыйнай дзейнасці айчынных музеяў (па М.Юхневіч). Характарыстыка асноўных этапаў: 1870-1890-я гг. – сяр. 1920-х гг. – асветніцкая мадэль музея (“пазашкольная адукацыя”, “культурна-асветніцкая работа”); к. 1920-х – 1950-я гг. – зацвярджэнне палітызаванай мадэлі (“палітыка-асветніцкая дзейнасць”, “масавая работа”); пач. 1960-х гг. – сяр. 1980-х гг. – інфарматыўная мадэль музея (“навукова-асветніцкая”, “ідэйна-выхаваўчая работа”); к. 1980-х гг – 1990-я гг. – камунікатыўная мадэль музея (“культурна-адукацыйная дзейнасць”). Сутнасць культурна-адукацыйнай дзейнасці сучасных музеяў.

*Тэма 2 Музейная педагогіка як тэарэтычная аснова культурна-адукацыйнай дзейнасці*

Гістарычныя перадумовы фарміравання музейнай педагогікі (экскурс у музейную педагогіку Германіі). Змест і паходжанне тэрміна “музейная педагогіка”. Размежаванне паняццяў “музейная педагогіка” і “культурна-адукацыйная дзейнасць”. Музейная педагогіка як міждысцыплінарная навуковая дысцыпліна. Тэарэтычныя асновы музейнай педагогікі. Паняцці і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

катэгорыі музейнай педагогікі. Роля музейнага прадмета і музейнага асяроддзя ў арганізацыі музейна-адукацыйнага працэсу. Асноўныя накірункі музейнай педагогікі.

*Тэма 3 Музейная аўдыторыя і яе вывучэнне*

Музейная аўдыторыя як сукупнасць людзей, аб’яднаных цікавасцю да музея. Асноўныя параметры для характарыстыкы музейнай аўдыторыі: сацыяльна-дэмаграфічныя прыкметы, ступень актыўнасці ў адносінах да музея, узровень “музейнай культуры” і інш. Дынаміка музейнай аўдыторыі.

Вывучэнне музейнай аўдыторыі. Сацыялагічныя даследаванні ў музеі. Асноўныя аспекты даследавання музейнай аўдыторыі: структура аўдыторыі, успрыняцце экспазіцыі, выніковасць культурна-адукацыйных праграм. Метады даследавання: апытанне (анкетаванне, інтэрв’ю), назіранне, вывучэнне музейнай дакументацыі, псіхалагічны эксперымент. Методыка збора першаснай сацыялагічнай інфармацыі ў музеі. Праблема “зваротнай сувязі”.

Вывучэнне наведвальніка ў замежных музеях (буйныя сацыялагічныя даследаванні ў музеях ЗША, Канады, Велікабрытаніі). Вывучэнне музейнай аўдыторыі ў СССР. Расійскія праграмы сацыялагічных даследаванняў у музеі («Музейны манітор»). Беларуская праграма вывучэння наведвальнікаў краязнаўчых музеяў “Музей і наведвальнік” (1998-1999).

*Тэма 4 Псіхалагічныя асаблівасці і методыка працы з рознымі катэгорыямі музейнай аўдыторыі*

Праца з дзецьмі дашкольнага, малодшага і сяэрдняга школьнага ўзросту: псіхалагічныя асаблівасці і спецыфіка зрокавага ўспрымання. Методыка работы з дзецьмі рознага ўзросту.

Асаблівасці работы са старшымі школьнікамі і студэнцкай моладдзю: псіхалагічныя адметнасці і метадычныя прыёмы.

Музей і школа: шляхі ўзаемадзеяння.

Спецыфіка работы з сямейнымі наведвальнікамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праца з людзьмі "трэцяга ўзросту".

Інклюзія ў музеі: агульныя правілы.

*Тэма 5 Формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў*

Характарыстыка базавых форм культурна-адукацыйнай дзейнасці (па М.Юхневіч). Асноўныя характарыстыкі базавых форм культурна-адуукацыйнай дзейнасці: традыцыйныя – новыя, дынамічныя – статычныя, групавыя – індывідуальныя, задвальняючыя запатрабаванасць у пазнанні – задавальняючыя запатрабаванасць у рэкрэацыі, якія мяркуюць актыўны ўдзел аўдыторыі – пасіўны ўдзел аўдыторыі. Дадатковыя характарыстыкі: простыя – комплексныя, разавыя – цыклавыя, для аднароднай – разнароднай аўдыторыі, унутрымузейныя – па-за музейныя, камерцыйныя – некамерцыйныя.

Традыцыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў (экскурсія, лекцыя, кансультацыя, клуб (гурток, студыя), сустрэча з цікавым чалавекам, канцэрт (вечарына), музейнае свята, музейная гульня і інш.): асноўныя характарыстыкі.

Сучасныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў: музейна-педагагічныя заняткі і праграмы, музейная анімацыя, музейныя квэсты і квізы, онлайн-формы працы з аўдыторыяй і інш.

Асаблівасці культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў розных профіляў.

Эфектыўныя і перспектыўныя кірункі культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў у сучасных умовах. Вопыт вядучых айчынных і замежных музеяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| | Уводзіны | 2 | | | Выбарачнае апытанне |
| 1. | Асноўныя этапы культурна-адукацыйнай дзейнасці айчынных музеяў | 4 | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка рэфератаў |
| 2. | Музейная педагогіка як тэарэтычная аснова культурна-адукацыйнай дзейнасці | 4 | 2 | | |
| 3. | Музейная аўдыторыя і яе вывучэнне | 4 | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка рэфератаў |
| 4. | Псіхалагічныя асаблівасці і методыка працы з рознымі катэгорыямі музейнай аўдыторыі | 4 | 3 | | |
| 5. | Формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў | 6 | 3 | | |
| | **Разам:** | **24** | **12** | **4** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**

**(завочная форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | |
| | Уводзіны | 1 | | Выбарачнае апытанне |
| 1. | Асноўныя этапы культурна-адукацыйнай дзейнасці айчынных музеяў | 1 | | Падрыхтоўка рэфератаў |
| 2. | Музейная педагогіка як тэарэтычная аснова культурна-адукацыйнай дзейнасці | 1 | 2 | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка рэфератаў |
| 3. | Музейная аўдыторыя і яе вывучэнне | 1 | 1 | Выбарачнае апытанне, пісьмовая работа |
| 4. | Псіхалагічныя асаблівасці і методыка працы з рознымі катэгорыямі музейнай аўдыторыі | 2 | 1 | Выбарачнае апытанне, пісьмовая работа |
| 5. | Формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| | **Разам:** | **8** | **4** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, 20 ліпен. 2016 г., № 413-З // Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Мінск, 2003 – 2017 . – Рэжым доступу : http://www.pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413&p1=1. – Дата доступу : 24.12.2019.

2. Комплекснае сацыялагічнае даследаванне работы музеяў Беларусі з аўдыторыяй // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: Навукова-інфарм. зб. Вып. 1 / Нац. б-ка Беларусі. –Мн., 2000.–108 с.

3. Максимова, А.С. Руководство по исследованиям посетителей музея / А.С. Максимова, С. А.Рюмина, Л.В. Лобанова . – М.: Политех, 2016. – 117 с.

4. Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь: стан, тэндэнцыі, перспектывы : матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі 24 лістапада 2011 г. / [рэдкал.: М. А. Бяспалая (старш.) і інш.]. - Мінск : [б. в.], 2012. - 143 с.

5. Музейная педагогика за рубежом: Работа музеев с детской аудиторией / Российский ин-т культурологии, Лаборатория музейного проектирования; сост. М.Ю. Юхневич. – М., 1997 [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.future.museum.ru/lmp/edu/child3.htm– Дата доступа : 24.12.2019.

6. Сборник трудов Творческой лаборатории "Музейная педагогика" Кафедры музейного дела / М-во культуры Рос. Федерации. Акад. переподгот. работников искусства, культуры и туризма; Сост. И. М. Коссова. - М. : Акад. переподгот. работников искусства, культуры и туризма Рос. Федерации, 2003- (ООО Реал-Групп). - Вып. 4: Музей для всех. - 2003 (ООО Реал-Групп). - 195, [1] с. : табл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Столяров, Б. А. Музейная педагогика : история, теория, практика : учебное пособие / Б.А. Столяров. - Москва : Высшая школа, 2004. - 215, [1] с.

8. Юхневич, М.Ю. Я поведу тебя в музей: Учеб. пособие по музейной педагогике / Ю.М. Юхневич /М-во культуры РФ. Рос. ин-т культурологии. – М., 2001. – 223 с.

*Дадатковая*

1. Ваньшин, С. Н. Социокультурная реабилитация инвалидов музейными средствами: Метод. пособ./ С.Н. Ваньшин, О.П. Ваньшина— 2-е изд., испр. и доп. — М.: Изд-во ГДМ, 2009. — 76 с.

2. Галинская, А.В. Культурно-образовательная деятельность военно-исторических музеев по сохранению культурного наследия / А.В. Галинская // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. - 2018. - № 1 (29). - С. 178-186.

3. Качан, М. Музейная педагогика. Голландский опыт / М .Качан, С. Мартинсон, Л. Чернявская // Мир музея. – 2011. - №8. – С. 32 – 34.

4. Копелянская, Н. Подростки в музее: что важно для них? / Н. Копелянская, Л. Коган-Лернер // Мир музея. – 2012. - №10. – С. 23 – 26.

5. Культурно-образовательная деятельность музея. Методы работы музеев по привлечению посетителей. Из зарубежного и российского опыта: дайджест / М-во культуры Свердл. обл., Свердл. обл. краевед. музей, Центр инновационных музейных технологий; сост. Е. А. Титова; отв. за вып. С. К. Швецова. – Екатеринбург, 2015. – 56 с.

6. Мацкевич, М.В. Музейный посетитель – «Великий немой»: время игры или диалога / М.В. Мацкевич // Музей и его аудитория. Маркетинговая стратегия. Сборник трудов творческой лаборатории «Музейная педагогика» кафедры музейного дела. Вып.7 – М.: АПРИКТ, 2006 – С.143 – 147.

7. Медведева, Е.Б. Музейная аудитория и методы общения с публикой / Е.Б. Медведева // Музей. – 2014. - №4. – С. 35 – 37.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Музей и образование : сборник научных трудов / [редкол.: Н. И. Ивановская и др. ; науч. ред. С. Т. Махлина]. - Санкт-Петербург : [б. и.], 1999. - 119 с.

9. Музейная педагогика : из опыта методической работы / под ред.: А. Н. Морозовой, А. В. Мельниковой. - Москва : Сфера, 2006. - 416 с.

10. Музейная педагогіка. Праблемы арганізацыі работы з дзецьмі : навукова-метадычны зборнік / [уклад. В. У. Міронччык]. - Мінск : [б. в.], 1997. - 70, [2] с. - (Музейныя сшыткі).

11. Панкратова, Т.Н. Занятия и сценарии с элементами музейной педагогики для младших школьников: первые шаги в мир культуры : учебно-методическое пособие. - Москва : ВЛАДОС, 2000. - 158, [1] с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання: лекцыйныя і семінарскія заняткі, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя метады (групавыя дыскусіі, мадэліраванне практычных сітуацый і інш.), візуальныя метады (метады ілюстрацыі, дэманстрацыі, відэаматэрыял).

У ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы магістрантаў

Арганізацыя самастойнай работы магістрантаў прадугледжвае падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падраздзелах вучэбнай дысцыпліны, вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўку да заліку і інш.

Самастойная работа магістрантаў накіравана на:

- фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;
- засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;
- развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення заліка.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці магістрантаў

Арганізацыя вучэбнай работы магістрантаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук, анліз і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне.

Для дыягностыкі атрыманых магістрантаў ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– вуснае апытанне па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– падрыхтоўка рэфератаў па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– выступленні на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці**

| Балы | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адсутнасць ведаў і кампетэнтнасці ў межах дысцыпліны; адмова ад адказу. |
| 2 (два) | Фрагментарныя веды ў рамках дысцыпліны; веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай дысцыпліны; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых памылак; пасіўнасць на практычных занятках, нізкі ўзровень культуры ў выкананні і афармленні заданняў. |
| 3 (тры) | Недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках дысцыпліны; веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выкладанне адказу на пытанні з істотнымі памылкамі; слабае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; няўменне арыентавацца ў сутнасці асноўных тэорый, канцэпцый і кірункаў вывучаемай дысцыпліны; пасіўнасць на практычных занятках, нізкі ўзровень культуры ў выкананні і афармленні заданняў. |
| 4 (чатыры) | Мінімальна дастатковы аб'ём ведаў у рамках дысцыпліны; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне выкарыстоўваць яго ў вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім ацэнку; работа пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 5 (пяць) | Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных задач; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім параўнальную ацэнку; самастойная работа на практычных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 6 (шэсць) | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных задач; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім параўнальную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастаткова высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 7 (сем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 8 (восем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай дысцыпліны; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 9 (дзевяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; дакладнае выкарыстанне навуковай |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная сістэматычная самастойная работа на практычных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 10 (дзесяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, а таксама па асноўных пытаннях па-за яе межамі; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне эфектыўна яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай праграмы; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін; самастойная творчая работа на практычных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ